УДК 903/904«631/637»(476.1)

## ПАМЯТНИКИ КАМЕННОГО И БРОНЗОВОГО ВЕКОВ В ПРАВОБЕРЕЖЬЕ НЕМАНА ОКОЛО СТОЛБЦОВ (по результатам исследований 2012–2014 гг.)

***В. В. АШЕЙЧИК***[1]***, А. В. ВАЙТОВИЧ***[2]***, И. Л. ПРИСТАВКО***[2]

[1]*Институт истории Национальной академии наук Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь*
[2]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Представлены предварительные результаты археологических разведок, проведенных авторами в правобережье р. Неман около г. Столбцы Минской области в 2012–2014 гг. Отмечается, что было исследовано 13 памятников археологии, три из которых выявлены впервые. Упорядочена нумерация памятников, локализованных в окрестностях деревень Акинчицы и Новый Свержень. На основании изучения находок, полученных в ходе сбора подъемного материала и шурфовок, уточнены относительные датировки ряда стоянок, а также дополнены существующие представления о культурных процессах в регионе в первобытную эпоху. Сделан вывод о непрерывном и очень интенсивном освоении долины Немана в окрестностях Столбцов на протяжении всего доисторического периода, начиная от финального палеолита до бронзового и железного веков включительно.

**Образец цитирования:**
Ашэйчык В. У., Вайтовіч А. У., Прыстаўка І. Л. Помнікі каменнага і бронзавага вякоў у правабярэжжы Нёмана каля Стоўбцаў (паводле даследаванняў 2012–2014 гг.) // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2018. № 2. С. 118–129.

**For citation:**
Asheichyk V. U., Vaitovich A. U., Prystauka I. L. Stone and bronze age sites on the right bank of the Neman River near Stoŭbcy (according to investigations of 2012–2014). *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2018. No. 2. P. 118–129 (in Belarus.).

**Авторы:**
***Виталий Владимирович Ашейчик*** – научный сотрудник отдела сохранения и использования археологического наследия.
***Александра Владимировна Вайтович*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета.
***Иван Леонидович Приставко*** – магистрант кафедры археологии и специальных дисциплин исторического факультета. Научный руководитель – кандидат исторических наук, доцент О. Л. Липницкая.

**Authors:**
***Vitali U. Asheichyk***, researcher at the department of conservation and use of the archaeological heritage.
*vitali.asheichyk@gmail.com*
***Aliaksandra U. Vaitovich***, PhD (archaeology); associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*vaitovich.aliaksandra@gmail.com*
***Ivan L. Prystauka***, postgraduate student at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history.
*pristavko.ivan@mail.ru*

***Ключевые слова:*** каменный век; бронзовый век; археологические памятники; кремневые артефакты; керамическая посуда; Неман; Западная Беларусь.

***Благодарность.*** Авторы искренне благодарны студентам исторического факультета БГУ, принимавшим участие в полевых работах, а также А. Н. Вашанову, У. В. Грибу и А. Ю. Ткачеву за выполнение рисунков отдельных артефактов. Отдельно благодарим А. Ю. Ткачева за консультативную помощь в атрибуции керамики.

# ПОМНІКІ КАМЕННАГА І БРОНЗАВАГА ВЯКОЎ У ПРАВАБЯРЭЖЖЫ НЁМАНА КАЛЯ СТОЎБЦАЎ (паводле даследаванняў 2012–2014 гг.)

***В. У. АШЭЙЧЫК***[1], ***А. У. ВАЙТОВІЧ***[2], ***І. Л. ПРЫСТАЎКА***[2]

[1]*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь*
[2]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Прадстаўлены папярэднія вынікі археалагічных разведак, праведзеных аўтарамі ў правабярэжжы р. Нёман каля г. Стоўбцы Мінскай вобласці ў 2012–2014 гг. Адзначаецца, што было абследавана 13 помнікаў археалогіі, з іх тры выяўлены ўпершыню. Упарадкавана нумарацыя археалагічных помнікаў, лакалізаваных у ваколіцах вёсак Акінчыцы і Новы Свержань. На падставе вывучэння знаходак, сабраных у ходзе паверхневых збораў і шурфовак, удакладнена адноснае датаванне шэрагу стаянак, а таксама дапоўнены наяўныя ўяўленні аб асаблівасцях культурных працэсаў у рэгіёне ў першабытную эпоху. Зроблена выснова аб непарыўным і вельмі інтэнсіўным асваенні даліны Нёмана ў ваколіцах Стоўбцаў на працягу ўсяго дагістарычнага перыяду, пачынаючы ад фінальнага палеаліту да бронзавага і жалезнага вякоў уключна.

***Ключавыя словы:*** каменны век; бронзавы век; археалагічныя помнікі; крамянёвыя артэфакты; керамічны посуд; Нёман; Заходняя Беларусь.

***Падзяка.*** Аўтары шчыра ўдзячныя студэнтам гістарычнага факультэта БДУ, якія прымалі ўдзел у палявых работах, а таксама А. М. Вашанаву, У. В. Грыбу і А. Ю. Ткачову за выкананне малюнкаў асобных артэфактаў. Асобна дзякуем А. Ю. Ткачову за кансультатыўную дапамогу пры атрыбуцыі керамікі.

# STONE AND BRONZE AGE SITES ON THE RIGHT BANK OF THE NEMAN RIVER NEAR STOŬBCY (according to investigations of 2012–2014)

***V. U. ASHEICHYK***[a], ***A. U. VAITOVICH***[b], ***I. L. PRYSTAUKA***[b]

[a]*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, 1 Akademičnaja Street, Minsk 220072, Belarus*
[b]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*
*Corresponding author: V. U. Asheichyk (vitali.asheichyk@gmail.com)*

The article presents preliminary results of the archaeological surveys conducted by the authors on the right bank of the Neman River near Stoŭbcy, Minsk Region, Belarus in 2012-2014. Thirteen archaeological sites have been investigated; three of them are newly discovered. Analysis of artefacts obtained in the course of surface collection and test pitting allows determining more precisely relative chronology of some sites as well as elaborating of an actual conception on cultural processes in the region during the prehistory. The authors make a conclusion that the part of the Neman River valley near Stoŭbcy was settled continuously and intensively during the whole prehistoric period, from the Final Palaeolithic till the Bronze and Iron Ages.

***Key words:*** Stone Age; Bronze Age; archaeological sites; flint artefacts; pottery; Neman River; Western Belarus.

***Acknowledgements.*** We are sincerely grateful to students of Faculty of History, Belarusian State University, who participated in the fieldwork, as well as to A. M. Vashanau, U. V. Hryb, A. Y. Tkachou for drawings of some artefacts. We thank A. Y. Tkachou also for his help in pottery attribution.

## Уводзіны

Пачатак вывучэння археалагічных помнікаў эпохі каменя на тэрыторыі сучаснага Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці адносіцца да 1910-х гг. і звязваецца з імем Л. Савіцкага [1, s. 48]. У 1950-х – 2000-х гг. даследаванні ў вярхоўях Нёмана праводзіліся шэрагам навукоўцаў, сярод якіх у першую чаргу не-

абходна узгадаць М. М. Чарняўскага, В. Л. Лакізу, В. М. Сідаровіча, В. С. Абухоўскага[1]. Спецыялісты выявілі некалькі дзясяткаў помнікаў, на частцы з іх правялі раскопкі рознай ступені маштабнасці. Матэрыялы, атрыманыя на некаторых паселішчах (Кругліца І (Лысая Гара), Русаковічы І, VII, IX і Сверынава-Куцец), сталі апорнымі для рэканструкцыі культурных працэсаў эпохі неаліту – бронзавага веку ў Верхнім Панямонні (гл., напрыклад, [2; 3]).

У 2012–2014 гг. археалагічнае вывучэнне Стаўбцоўскага раёна працягнулі аўтары гэтага артыкула. Задачы даследаванняў заключаліся ў верыфікацыі раней вядомых пунктаў і пошуку новых дагістарычных помнікаў у вярхоўях Нёмана, а таксама ў вызначэнні характару асваення рачной даліны ў ваколіцах Стоўбцаў на працягу каменнага і бронзавага вякоў. Вынікі трох палявых сезонаў часткова публікаваліся [4–8]. Дадзены артыкул прысвечаны характарыстыцы новых матэрыялаў, атрыманых падчас археалагічных разведак у прававабярэжжы Нёмана – на ўчастку паміж Стоўбцамі і вёскамі Новы Свержань і Мікалаеўшчына (мал. 1).

## Помнікі і матэрыялы

**1. Акінчыцы** (вёска, раней засценак, у 1976 г. уключана ў межы г. Стоўбцы, зараз знаходзіцца на паўднёвым усходзе горада). У 2012–2013 гг. В. У. Ашэйчыкам сумесна з М. М. Чарняўскім і А. У. Вайтовіч праводзіліся абследаванні трох раней вядомых археалагічных помнікаў у ваколіцах былой вёскі (мал. 1, *1–3*; мал. 2, *а*, *1–3*).

***Акінчыцы III*** – паселішча каменнага – жалезнага вякоў. Знаходзіцца праз 1,25 км на паўднёвы захад ад Акінчыц, на левым беразе р. Альбута (мал. 1, *1*; мал. 2, *а*, *1*). Займае невялікае ўзвышша на поплаве Нёмана памерамі каля 150×60 м, праз якое праходзіць палявая дарога.

Помнік быў выяўлены ў 2008 г. М. М. Чарняўскім[2] [9, с. 284]. У 2012–2013 гг. В. У. Ашэйчык, А. У. Вайтовіч і М. М. Чарняўскі правялі паверхневыя зборы і шурфоўку.

У 2012 г. у цэнтральнай частцы помніка быў закладзены шурф плошчай 1 м$^2$, у 2013 г. з поўначы да яго прырэзалі шурф памерамі 2×3 м. Адразу пад дзірваном ішоў пласт гумусаванага дробназярністага супеску шэрага і цёмна-шэрага колеру магутнасцю да 0,3–0,5 м, які падсцілаўся жоўтым дробназярністым пяском. Шурфы даследаваліся на глыбіню да 0,6 м. У шурфах выяўлены 1008 артэфактаў, пераважная большасць з іх залягала на глыбіні да 0,3 м.

---

[1]*Чернявский М. М.* Отчет об археологических исследованиях памятников эпохи неолита и бронзы в бассейне р. Нёман в 1962–63 гг. // Цэнтр. навук. арх. Нац. акад. навук Беларусі (далей – ЦНА НАНБ). Фонд археал. навук. дакументацыі (далей – ФАНД). Воп. 1. Спр. 227. С. 1–3, 26–31; *Чернявский М. М.* Отчет об археологических исследованиях в северо-западной Белоруссии в 1965 году // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 304. С. 1–10; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1975 годзе. ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 513. С. 15–23, 38–45; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1976 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 550. С. 1, 5–6, 17–47; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1978 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 588. С. 20–27; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1979 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 633. С. 5–8, 33–37; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях Нёманскага неалітычнага атрада ў 1981 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 724. С. 1–8, 18–22; *Чарняўскі М. М.* Справаздача Нёманскай неалітычнай групы аб даследаваннях археалагічных помнікаў у 1983 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 849. С. 7–8; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях за 1985 г. Краснасельскага археалагічнага атрада (група М. М. Чарняўскага) // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 922. С. 8–10; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1986 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 963. С. 36–37; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных абследаваннях у 1989 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1180. С. 10–11; *Лакіза В. Л.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на Панямонні ў 1995 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1566. С. 15–23; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных работах Нёманскай археалагічнай групы ў чэрвені-жніўні 1995 г. (разведкі ў Сталпецкім, Дзятлаўскім і Слонімскім р-нах, раскопкі на стаянцы Асавец-2 Бешанковіцкага р-на) // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1591. С. 1–2, 19; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых даследаваннях у 1996 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1641. С. 7–10; *Лакіза В. Л.* Справаздача аб археалагічных работах на Панямонні ў 1999 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1795. С. 4; *Сідаровіч В. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Мінскай і Брэсцкай абласцях у 1999 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1834. С. 5–7, 22–31; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных работах у 2000 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1869. С. 19; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2001 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 1930. С. 1–13; *Лакіза В. Л.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у басейне Нёмана ў 2003 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2070. С. 9–11; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Паўночна-Заходняй Беларусі ў 2003 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2091. С. 6–9, 17–22; *Абухоўскі В. С.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2004 годзе // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2205. С. 4–5; *Лакіза В. Л.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на Панямонні ў 2005 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2288. С. 14; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны ў 2005 г. ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2270. С. 1–10, 23; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Стаўбцоўскага, Вілейскага, Мядзельскага і Бешанковіцкага р-наў у 2006 г. ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2387. С. 2–5; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2008 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2615. С. 2–6; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб даследаваннях археалагічнай экспедыцыі Белдзяржуніверсітэта ў басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны летам 2009 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2698. С. 3–5; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2010 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2775. С. 11; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2011 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 7–17.

[2]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2008 г. // ЦНА НАНБ. ФАНД. Воп. 1. Спр. 2615. С. 3.




*Мал. 1.* Карта археалагічных помнікаў у правабярэжжы Нёмана, абследаваных у 2012–2014 гг.:
*1* – Акінчыцы III; *2* – Акінчыцы IV; *3* – Акінчыцы V; *4* – Новы Свержань I; *5* – Новы Свержань II; *6* – Новы Свержань III; *7* – Новы Свержань IV; *8* – Новы Свержань IVа; *9* – Новы Свержань IVб; *10* – Новы Свержань V; *11* – Новы Свержань VI; *12* – Новы Свержань VII; *13* – Мікалаеўшчына VIII. Малюнак В. У. Ашэйчыка

*Fig. 1.* Map of the archaeological sites on the right bank of the Neman River investigated in 2012–2014:
*1* – Akinčycy III; *2* – Akinčycy IV; *3* – Akinčycy V; *4* – Novy Svieržań I; *5* – Novy Svieržań II; *6* – Novy Svieržań III; *7* – Novy Svieržań IV; *8* – Novy Svieržań IVa; *9* – Novy Svieržań IVb; *10* – Novy Svieržań V; *11* – Novy Svieržań VI; *12* – Novy Svieržań VII; *13* – Mikalajeŭščyna VIII. Drawing by V. U. Asheichyk

Усяго на помніку выяўлены 1020 знаходак: 683 крамянёвыя артэфакты (агульная структура крамянёвага інвентару прадстаўлена ў табліцы), 292 фрагменты ляпной керамікі (з іх толькі 125 фрагментаў прыдатныя да таксанамічнага вызначэння), 33 фрагменты кругавой керамікі, адзін нявызначаны гліняны выраб, чатыры кавалкі глінянай абмазкі, сем дробных фрагментаў костак.

Сабраныя матэрыялы адлюстроўваюць шэраг этапаў засялення тэрыторыі паселішча. Найбольш верагодна, эпохай фінальнага палеаліту варта датаваць фрагмент пласціны, знятай з двухпляцовачнага нуклеуса. Мезалітычны перыяд функцыянавання помніка прадстаўлены двума мікралітамі з прытупленым краем (мал. 3, *1*, *2*), серыяй рэгулярных пласцін, скрабачамі (мал. 3, *10*, *11*). Да ранненеалітычнай прыпяцка-нёманскай культуры аднесены тры арнаментаваныя фрагменты венчыкаў (мал. 4, *1*, *2*) і 47 фрагментаў сценак (два з іх арнаментаваныя). З нёманскай культурай звязваюцца адзін фрагмент венчыка, 65 фрагментаў сценак (два з іх арнаментаваныя: мал. 4, *3*, *4*). У калекцыі вылучаны абломкі посуду як лысагорскага, так і дабраборскага этапаў культуры. Акрамя таго, ідэнтыфікаваны адзін фрагмент сценкі пасудзіны кола культуры шнуравой керамікі. Позманеалітычны комплекс дапаўняецца серыяй макралітычных рэгулярных пласцін з рэтушшу (мал. 3, *7*–*9*) і трохвугольным наканечнікам стралы (мал. 3, *3*). Аб засяленні тэрыторыі помніка ў перыяд бронзавага веку сведчаць матэрыялы тшцінецкага культурнага кола: тры фрагменты керамікі і чаранковы наканечнік стралы з біфацыяльнай апрацоўкай (мал. 3, *4*). Нешматлікія матэрыялы – пяць фрагментаў керамікі (мал. 4, *5*) – аднесены да жалезнага веку. Усе абломкі кругавога посуду датуюцца эпохай Позняга сярэднявечча – Новым часам.

Такім чынам, даследаванні 2012–2013 гг. дазволілі істотна скарэктаваць культурна-храналагічную інтэрпрэтацыю помніка. Першапачаткова М. М. Чарняўскі датаваў стаянку эпохай мезаліту[3] [9, с. 284]. Новыя матэрыялы даюць падставы меркаваць аб існаванні паселішча ў перыяд ад фінальнага палеаліту да жалезнага веку. Актыўнае выкарыстанне тэрыторыі помніка працягвалася і ў пазнейшыя часы.

[3]Там жа. С. 3.




Мал. *2*. Размяшчэнне першабытных помнікаў у ваколіцах вёсак Акінчыцы і Новы Свержань (*а*) і Мікалаеўшчына (*б*), абследаваных у 2012–2014 гг.: *1* – Акінчыцы III; *2* – Акінчыцы IV; *3* – Акінчыцы V; *4* – Новы Свержань I; *5* – Новы Свержань II; *6* – Новы Свержань III; *7* – Новы Свержань IV; *8* – Новы Свержань IVа; *9* – Новы Свержань IVб; *10* – Новы Свержань V; *11* – Новы Свержань VI; *12* – Новы Свержань VII; *13* – Мікалаеўшчына VIII. Малюнак В. У. Ашэйчыка. Спадарожнікавыя здымкі: *Google Earth*, *CNES/Airbus*

*Fig. 2*. Location of the prehistoric sites near villages Akinčycy and Novy Svieržań (*a*) and Mikalajeŭščyna (*b*) investigated in 2012–2014: *1* – Akinčycy III; *2* – Akinčycy IV; *3* – Akinčycy V; *4* – Novy Svieržań I; *5* – Novy Svieržań II; *6* – Novy Svieržań III; *7* – Novy Svieržań IV; *8* – Novy Svieržań IVa; *9* – Novy Svieržań IVb; *10* – Novy Svieržań V; *11* – Novy Svieržań VI; *12* – Novy Svieržań VII; *13* – Mikalajeŭščyna VIII. Drawing by V. U. Asheichyk. Satellite images: Google Earth, CNES/Airbus

Табліца

**Тэхніка-марфалагічная структура крамянёвага інвентару з помнікаў Акінчыцы III і Мікалаеўшчына VIII**

Table

**General structure of the lithic assemblages of the Akinčycy III and Mikalajeŭščyna VIII sites**

| Марфалагічная група* | Катэгорыя | Колькасць знаходак | |
|---|---|---|---|
| | | Акінчыцы III | Мікалаеўшчына VIII |
| I | Канкрэцыі і абломкі канкрэцый | – | 2 |
| II | Нуклеусы і іх фрагменты | 1 | 12 (гл. мал. 6, *1*) |
| | Лушчані і іх фрагменты | 1 | – |
| | Абломкі нуклеападобныя | – | 23 |
| III | Адшчэпы і іх фрагменты | 236 | 301 |
| | Пласціны і іх фрагменты | 64 | 153 |
| | Лускавінкі | 176 | 117 |
| | Бугарковыя лускавінкі | – | 2 |
| | Дробныя фрагменты нявызначаных сколаў | 85 | – |
| | Невызначальныя крамянёвыя абломкі | 84 | 212 |

Заканчэнне табліцы
Ending table

| Марфалагічная група* | Катэгорыя | Колькасць знаходак | |
|---|---|---|---|
| | | Акінчыцы III | Мікалаеўшчына VIII |
| IV | Рабрыстыя сколы | 3 | 15 |
| | Сколы падпраўкі паверхні расшчаплення нуклеуса | – | 2 |
| | Сколы ажыўлення ўдарнай пляцоўкі нуклеуса | – | 3 |
| | Сколы з захлыстам | – | 2 (гл. мал. 5, *8*) |
| V | Разцы | – | 6 |
| | Скрабкі | 4 (гл. мал. 3, *5*, *6*) | 10 |
| | Скрабачы | 3 (гл. мал. 3, *10*, *11*) | 3 |
| | Пласціны са скошаным рэтушшу канцом | – | 1 (гл. мал. 5, *9*) |
| | Праколкі | – | 3 |
| | Наканечнікі стрэл | 2 (гл. мал. 3, *3*, *4*) | 1 (гл. мал. 5, *11*) |
| | Мікраліты | 2 (гл. мал. 3, *1*, *2*) | 7 (гл. мал. 5, *1–7*) |
| | Шліфаваныя сякеры | – | 1 (гл. мал. 6, *2*) |
| | Камбінаваныя прылады | 1 | – |
| | Адшчэпы і іх фрагменты з рэтушшу | 11 | 29 |
| | Пласціны і іх фрагменты з рэтушшу | 6 (гл. мал. 3, *7–9*) | 13 |
| | Рабрыстыя сколы з рэтушшу | – | 1 |
| | Сколы падпраўкі ўдарнай пляцоўкі з рэтушшу | – | 1 |
| | Крамянёвыя абломкі з рэтушшу | 1 | – |
| | Фрагменты нявызначаных прылад | 3 | 3 |
| | Пласціны, зламаныя ў месцы выемкі | – | 1 |
| | Разцовыя сколы | – | 1 |
| | Мікраразцы | – | 1 |
| | Сколы са шліфаваных сякер | – | 1 |
| VI | Адбойнікі крамянёвыя | – | 1 |
| Усяго | | 683 | 928 |

* I – сыравіна; II – нуклеусы і нуклеападобныя абломкі; III – прадукты дэбітажу; IV – тэхнічна вызначальныя формы; V – артэфакты з другаснай апрацоўкай і адходы іх вытворчасці; VI – прылады для апрацоўкі крэменю.

***Акінчыцы IV*** – месцазнаходжанне крамянёвых вырабаў і кругавой керамікі. Знаходзіцца праз 1,6 км на паўднёвы захад ад Акінчыц, на выступе высокага поплаву на правым беразе р. Нёман, паўночней за вусце р. Альбуты (гл. мал. 1, *2*; мал. 2, *а*, *2*).

Помнік быў выяўлены ў 2008 г. М. М. Чарняўскім. У выніку паверхневых збораў і шурфоўкі быў атрыманы нешматлікі матэрыял, частка якога датавалася мезалітам[4] [9, с. 4; 10, с. 284]. У справаздачы і публікацыі даследчык абазначыў пункт як «Вусце Альбуты». У сувязі з нязручнасцю такой назвы помнік быў прывязаны да Акінчыц.

У 2012 г. абследаванне помніка правёў В. У. Ашэйчык. На палявой дарозе, што праходзіць праз стаянку, былі знойдзены пяць крамянёвых артэфактаў (чатыры адшчэпы і адзін абломак нявызначанага скола), а таксама адзін фрагмент кругавой керамікі.

***Акінчыцы V*** – месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў і кругавой керамікі. Знаходзіцца праз 1,4 км на паўднёвы захад ад Акінчыц, праз 0,05 км на паўднёвы захад ад помніка Акінчыцы III, размешчана на невысокім пясчаным надпоплаўным узвышшы памерам каля 70×40 м (мал. 1, *3*; мал. 2, *а*, *3*).

У 2005 г. М. М. Чарняўскі выявіў тут культурны пласт магутнасцю да 0,35 м з кругавой керамікай[5].

У 2013 г. абследаванне помніка правёў В. У. Ашэйчык. На паўночна-ўсходняй ускраіне ўзвышша быў знойдзены крамянёвы адшчэп.

**2. Вёска Новы Свержань** (цэнтр с/с). У 2013 г. В. У. Ашэйчык абследаваў дзевяць археалагічных

[4]Там жа. С. 4.
[5]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны ў 2005 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2270. С. 2–3.




*Мал. 3.* Акінчыцы III. Крамянёвыя вырабы: *1*, *2* – мікраліты; *3*, *4* – наканечнікі стрэл;
*5*, *6* – скрабкі; *7– 9* – рэтушаваныя пласціны; *10*, *11* – скрабачы.
Мал. А. М. Вашанава (*1*, *2*), У. В. Грыба (*4*) і А. У. Вайтовіч (*3*, *5–11*)

*Fig. 3.* Akinčycy III. Flint artefacts: *1*, *2* – microliths; *3*, *4* – arrowheads;
*5*, *6* – end-scrapers; *7–9* – retouched blades; *10*, *11* – micro side-scrapers.
Drawing by A. M. Vashanau (*1*, *2*), U. V. Hryb (*4*) and A. U. Vaitovich (*3*, *5–11*)

помнікаў у ваколіцах вёскі, два з іх выяўлены ўпершыню (мал. 1, *4–12*; мал. 2, *а*, *4–12*).

***Новы Свержань I, урочышча Шыркоўская лука*** – стаянка каменнага – бронзавага вякоў. Знаходзіцца насупраць цэнтральнай часткі в. Новы Свержань, праз 0,1–0,15 км на паўночны ўсход ад р. Нёман, праз 0,9 км на паўднёвы ўсход ад чыгуначнага моста праз раку, размешчана на пясчаным узвышшы памерамі каля 50×150 м (мал. 1, *4*; мал. 2, *а*, *4*).

Помнік выявіў М. М. Чарняўскі у 1975 г.[6] У 1999 г. В. М. Сідаровіч правёў раскопкі на плошчы 18 м$^2$. Атрыманы матэрыял быў датаваны эпохай неаліту – бронзавага веку[7]. У 2000–2010-х гг. паўторныя абследаванні помніка праводзіў М. М. Чарняўскі. У справаздачнай публікацыі ён прывязаў стаянку да Акінчыц пад нумарам 2[8] [10, с. 41; 11, с. 320].

Падчас паверхневых збораў 2013 г. на помніку знойдзены рэтушаваны адшчэп і фрагмент пасудзіны лысагорскага этапу нёманскай культуры (мал. 4, *6*).

***Новы Свержань II, урочышча Замак Чартарыйскага*** – месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў і керамікі, рэшткі замка бастыённага тыпу. Праз 0,4–0,5 км на ўсход ад в. Новы Свержань, праз 1,7 км на паўднёвы ўсход ад чыгуначнага моста цераз р. Нёман і праз 1,7 км на паўднёвы захад ад Акінчыц знаходзяцца рэшткі замка бастыённага тыпу [12]. На паўднёвым ускрайку абарончых збудаванняў (мал. 1, *5*; мал. 2, *а*, *5*) М. М. Чарняўскі,

[6]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1975 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 513. С. 19.
[7]*Сідаровіч В. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Мінскай і Брэсцкай абласцях у 1999 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 1834. С. 5–7, 22–31.
[8]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных работах у 2000 годзе // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 1869. Мал. 33; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных работах у 2011 годзе // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 7.




*Мал. 4.* Акінчыцы III (*1–5*), Новы Свержань I (*6*), Новы Свержань IV (*7*), Новы Свержань VI (*8*).
Кераміка і крамянёвыя вырабы: *1, 2* – кераміка тыпу Дубічай; *3, 4* – кераміка тыпу Добры Бор;
*5* – кераміка жалезнага веку; *6* – кераміка тыпу Лысая Гара; *7* – скрабок; *8* – мікраліт з прытупленным краем.
Малюнак А. Ю. Ткачова (*1–5*) і А. У. Вайтовіч (*6–8*)

*Fig. 4.* Akinčycy III (*1–5*), Novy Svieržań I (*6*), Novy Svieržań IV (*7*); Novy Svieržań VI (*8*).
Pottery and flint artefacts: *1, 2* – pottery of Dubičiai type; *3, 4* – pottery of Dobry Bor type;
*5* – Iron Age pottery; *6* – pottery of Lysaja Hara type; *7* – end-scraper; *8* – backed bladelet.
Drawing by A. Y. Tkachou (*1–5*) and A. U. Vaitovich (*6–8*)

які абследаваў помнік у 1975 і 2005 гг., адзначаў рэшткі стаянкі каменнага веку[9]. Звесткі пра помнік змешчаны яшчэ ў некалькіх справаздачах і публікацыях гэтага даследчыка за 2000–2010-я гг.[10] [10, с. 40; 11, с. 320]. У апошніх працах помнік праходзіў пад назвай «Акінчыцы І».

Падчас паверхневых збораў 2013 г. на помніку знойдзены чатыры фрагменты пласцін, 17 адшчэпаў і іх фрагментаў, дзве лускавінкі, разцовы скол, дробны невызначальны крамянёвы абломак, адзін фрагмент керамікі нёманскай культуры, адзін фрагмент кругавога посуду.

***Новы Свержань III*** – стаянка каменнага – бронзавага вякоў. Знаходзіцца праз 0,45 км на паўночны ўсход ад цэнтральнай часткі в. Новы Свержань, праз 1,2 км на поўдзень ад Стоўбцаў і 1,25 км на паўднёвы ўсход ад чыгуначнага моста праз р. Нёман, размешчана на пясчанай дзюне памерамі каля 170×100 м (мал. 1, *6*; мал. 2, *а*, *6*).

Помнік выяўлены М. М. Чарняўскім у 2001 г. У выніку паверхневых збораў і шурфоўкі даследчыкам былі атрыманы матэрыялы неаліту – бронзавага веку[11] [3, с. 218; 10, с. 41; 11, с. 320–321]. У справаздачы М. М. Чарняўскага за 2011 г. і яго ж артыкуле 2013 г. помнік прывязаны да Акінчыц пад нумарам 3.

У 2013 г. на помніку сабраны нешматлікі пад'ёмны матэрыял: дзевяць фрагментаў неалітычнай керамікі, лушчань, 20 адшчэпаў і іх фрагментаў, пласціна, пяць лускавінак, пяць невызначальных крамянёвых абломкаў, фрагмент рэтушаванага адшчэпа, два дробныя фрагменты перапаленых костак.

***Новы Свержань IV*** – стаянка каменнага веку. Знаходзіцца праз 0,7 км на паўночны ўсход ад в. Новы Свержань, праз 1 км на поўдзень ад Стоўбцаў, размешчана на выцягнутым узвышшы памерамі каля 170×45 м (мал. 1, *7*; мал. 2, *а*, *7*). Тэрыторыя помніка залесеная.

Помнік выяўлены ў 2001 г. М. М. Чарняўскім. Матэрыялы, атрыманыя ў выніку паверхневых збораў і шурфоўкі, былі аднесены да эпохі неаліту[12] [3, с. 218–219; 10, с. 41]. У 2000–2010-х гг. даследчык правёў шэраг паўторных абследаванняў помніка і змяніў яго назву на «Акінчыцы IV»[13] [11, с. 321].

[9]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1975 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 513. С. 19; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны ў 2005 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2270. С. 2.

[10]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2011 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 7.

[11]Там жа. С. 7–9.

[12]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2001 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 1930. С. 8–11; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Стаўбцоўскага, Вілейскага, Мядзельскага і Бешанковіцкага р-наў у 2006 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2387. Мал. 13, 14.

[13]*Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2011 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 9–10.

Падчас разведак у 2013 г. на паверхні помніка былі сабраны чатыры крамянёвыя артэфакты: скрабок (мал. 4, *7*), два фрагменты пласцін, адшчэп.

***Новы Свержань IVa*** – стаянка каменнага – бронзавага вякоў. Знаходзіцца праз 1 км на паўночны ўсход ад в. Новы Свержань, праз 0,8 км на поўдзень ад Стоўбцаў, праз 0,1 км на паўночны ўсход ад пункта Новы Свержань IV, размешчана на невялікім узвышэнні выступу поплаву р. Нёман (мал. 1, *8*; мал. 2, *a*, *8*). Цэнтральная частка ўзвышэння раздзімаецца.

Помнік выявіў у 2001 г. і абследаваў у 2005 і 2006 гг. М. М. Чарняўскі [10, с. 41][14]. У пачатку 2010-х гг. даследчык прывязаў пункт да Акінчыц[15] [11, с. 321].

У 2013 г. на паверхні выдзьмуха сабраны нешматлікі пад'ёмны матэрыял: тры фрагменты лушчаняў, пяць адшчэпаў і іх фрагментаў, лускавінка, маладыягнастычны фрагмент ляпной керамікі.

***Новы Свержань IVб*** – месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў. Знаходзіцца праз 1 км на паўночны ўсход ад в. Новы Свержань, праз 0,9 км на поўдзень ад Стоўбцаў, праз 0,15 км на ўсход ад пункта Новы Свержань IV на невялікім павышэнні на выступе высокага поплаву р. Нёман (мал. 1, *9*; мал. 2, *a*, *9*).

Помнік быў выяўлены М. М. Чарняўскім у 2001 г.[16] У 2011–2013 гг. даследчык прывёў звесткі пра яго месцазнаходжанне ў шэрагу сваіх прац, пры гэтым прывязаў яго да Акінчыц[17] [11, с. 321].

У 2013 г. на помніку быў праведзены візуальны агляд стану захаванасці. На суцэльна задзірнаванай паверхні пад'ёмны матэрыял не знойдзены.

***Новы Свержань V*** – стаянка каменнага веку. Знаходзіцца праз 0,8 км на паўночны ўсход ад в. Новы Свержань і праз 0,6 км на поўдзень ад Стоўбцаў на выцягнутым узвышшы працягласцю каля 350 м (мал. 1, *10*; мал. 2, *a*, *10*). Цэнтральная і паўночнаўсходняя часткі помніка параслыя дрэвамі.

Помнік выяўлены ў 2001 г. М. М. Чарняўскім[18]. У 2011 г. даследчык прывязаў пункт да Акінчыц[19] [11, с. 321].

У 2013 г. на помніку быў знойдзены фрагмент кругавой керамікі. Для высвятлення наяўнасці культурнага слоя былі закладзены два шурфы памерамі 1×1 м.

Шурф 1 быў разбіты ў паўночна-ўсходняй, найбольш высокай і залесенай, частцы ўзвышша. Ён выявіў наступную стратыграфію: пад дзірвановым слоем залягала цёмна-шэрая гумусаваная глеба, якая на глыбіні 0,35–0,4 м падсцілалася светлашэрым супескам. У шурфе, глыбіня якога дасягала 0,5 м, знойдзена крамянёвая лускавінка.

Шурф 2 быў закладзены ва ўсходняй, бязлесай, частцы дзюны. Адразу пад дзірвановым слоем ішоў пласт цёмна-шэрай гумусаванай глебы, якая на глыбіні 0,25–0,3 м пераходзіла ў шэра-аранжавы пясок. У шурфе, даследаваным на глыбіню 0,4 м, атрыманы пяць дробных абломкаў неалітычнай керамікі і фрагмент нявызначанага крамянёвага скола.

***Новы Свержань VI*** – стаянка каменнага веку. Выяўлена ўпершыню. Знаходзіцца праз 0,35 км на паўночны ўсход ад цэнтральнай часткі в. Новы Свержань, праз 1 км на паўднёвы ўсход ад чыгуначнага моста праз р. Нёман, праз 0,15 км на ўсход ад стаянкі Новы Свержань I, на астанцы высокага поплаву (мал. 1, *11*; мал. 2, *a*, *11*). На паўднёваўсходнім канцы павышэння размешчаны геадэзічны знак з нумарам ГЗГК-4210.

Побач са знакам былі знойдзены адшчэп і дробны невызначальны крамянёвы абломак, а таксама два дробныя фрагменты кругавога посуду. З мэтай высвятлення наяўнасці культурнага слоя праз 4 м на захад ад геадэзічнага знака закладзены шурф памерамі 1×1 м. Пад дзірвановым слоем залягаў цёмна-шэры дробназярністы гумусаваны супесак, які на глыбіні 0,35 м падсцілаўся светла-шэрым дробназярністым пяском. У шурфе, выбраным на глыбіню 0,45 м, было выяўлена 11 крамянёвых артэфактаў – фрагмент мікраліта з прытупленым рэтушшу краем (мал. 4, *8*), два фрагменты пласцін, шэсць адшчэпаў, два дробныя фрагменты нявызначаных сколаў, – а таксама фрагмент сценкі ляпной керамікі.

Помнік папярэдне датуецца перыядам мезаліту – неаліту.

***Новы Свержань VII*** – стаянка каменнага веку. Выяўлена ўпершыню. Знаходзіцца праз 0,5 км на паўночны ўсход ад в. Новы Свержань, праз 0,95 км на поўдзень ад г. Стоўбцы, праз 0,9 км на паўднёвы ўсход ад чыгуначанага моста праз р. Нёман, на надпоплаўным узвышшы памерамі 150×100 м (мал. 1, *12*; мал. 2, *a*, *12*).

На слабазадзірнаванай паўночнай частцы ўзвышша сустракаюцца крамянёвыя артэфакты і абломкі ляпнога посуду. Падчас абследаванняў 2013 г. мэта-

[14] *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны ў 2005 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2270. С. 23; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2001 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 1930. С. 8–9, 12; *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Стаўбцоўскага, Вілейскага, Мядзельскага і Бешанковіцкага р-наў у 2006 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2387. С. 5.

[15] *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2011 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 11.

[16] *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2001 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 1930. С. 8–9, 12.

[17] *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2011 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 11.

[18] *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2001 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 1930. С. 12–13.

[19] *Чарняўскі М. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2011 г. // ЦНА НАНБ ФАНД. Воп. 1. Спр. 2837. С. 11.

накіраваныя зборы пад'ёмнага матэрыялу на помніку не праводзіліся.

***3. Вёска Мікалаеўшчына*** (цэнтр с/с). У 2012 г. В. У. Ашэйчык, А. У. Вайтовіч і М. М. Чарняўскі абследавалі раней вядомыя помнікі ў ваколіцах вёскі [4]. Разведкі, якія праводзілі аўтары артыкула ў 2014 г., дазволілі нанесці на археалагічную карту Стаўбцоўскага раёна новы пункт.

***Мікалаеўшчына VIII*** – стаянка каменнага – бронзавага вякоў, селішча жалезнага веку, Позняга сярэднявечча – Новага часу. Выяўлена ўпершыню. Помнік размяшчаецца праз 0,45–0,5 км на паўночны захад ад в. Мікалаеўшчына, праз 0,65 км на поўдзень ад турбазы «Высокі Бераг», у прававбярэжным поплаве р. Нёман, на ўзвышшы даўжынёй каля 420 м (мал. 1, *13*; мал. 2, *б*, *13*).

Помнік быў выяўлены ў 2014 г. І. Л. Прыстаўкам. У тым жа годзе аўтары артыкула правялі збор пад'ёмнага матэрыялу і шурфоўку. Шурф памерамі 1×2 м быў закладзены ў паўночнай частцы помніка. У шурфе прасочана наступная стратыграфія: слой дзярніны і цёмна-шэрага дробназярністага гумусаванага супеску, які на глыбіні 0,25–0,3 м падсцілаўся слоем буйназярністага пяску жоўтага колеру. Знаходкі залягалі ў гумусаваным слоі, большасць з іх траплялася на глыбіні да 0,2 м. У шурфе, даследаваным на глыбіню 0,4 м, было выяўлена 87 артэфактаў (69 крамянёвых вырабаў і 18 фрагментаў керамікі).

Усяго падчас даследаванняў 2014 г. на помніку была атрымана калекцыя, якая налічвае 928 крамянёвых артэфактаў (агульная структура крамянёвага інвентару прадстаўлена ў табліцы) і 248 фрагментаў керамікі (з іх 196 прыдатныя для культурна-храналагічнай ідэнтыфікацыі).

Сабраныя знаходкі адлюстроўваюць шэраг этапаў засялення тэрыторыі помніка. Мезалітычны этап прадстаўлены яніславіцкім трохвугольнікам (мал. 5, *1*), трапецыямі (мал. 5, *2–7*), разцамі на зломе рэгулярных пласцін (мал. 5, *8*), мікаразцом, скрабачамі, серыяй рэгулярных пласцін і іх фрагментаў. Матэрыялы варта звязваць з познамезалітычнай яніславіцкай культурай. Аб існаванні паселішча ў перыяд неаліту – пачатковага перыяду бронзавага веку – сведчыць значная калекцыя керамікі і крамянёвых вырабаў. Да ранненеалітычнай прыпяцка-нёманскай культуры аднесены пяць фрагментаў сценак (адзін з іх арнаментаваны). Акрамя таго, ідэнтыфікаваны 30 абломкаў посуду нёманскай культуры (дзевяць з іх упрыгожаны арнаментам: мал. 6, *3–5*). У калекцыі прысутнічаюць матэрыялы і лысагорскага, і дабраборскага этапаў культуры. На помніку быў знойдзены фрагмент венчыка, аздабленне якога адпавядае прыкметам культуры шарападобных амфар (мал. 6, *6*). Яшчэ чатыры фрагменты сценак пасудзін (тры з іх арнаментаваныя) звязваюцца з колам культуры шнуравой керамікі (мал. 6, *7*, *8*). Згаданы керамічны




*Мал. 5.* Мікалаеўшчына VIII. Крамянёвыя вырабы: *1* – трохвугольнік; *2–7* – трапецыі; *8* – разец; *9* – пласціна са скошанным рэтушшу канцом; *10* – адшчэп; *11* – наканечнік стралы. Малюнак А. У. Вайтовіч

*Fig. 5.* Mikalajeŭščyna VIII. Flint artefacts: *1* – triangle; *2–7* – trapezes; *8* – burin; *9* – truncated blade; *10* – flake; *11* – arrowhead. Drawing by A. U. Vaitovich

комплекс дапаўняецца крамянёвым інвентаром: неалітам – пачатковым перыядам бронзавага веку варта датаваць нуклеус ад адшчэпаў з радыяльным сколваннем нарыхтовак (мал. 6, *1*), трохвугольны наканечнік стралы (мал. 5, *11*), серыю шырокіх пласцін, неапрацаваных і з апрацоўкай (мал. 5, *9*), адшчэп са шліфаванай спінкай, фрагмент шліфаванай біфасіяльнай сякеры (мал. 6, *2*). Найбольш верагодна, да гэтага перыяду можна аднесці два адшчэпы, атрыманыя пры вырабе прылад з дапамогай тэхнікі захавання поўнай асновы (мал. 5, *10*).

На асваенне тэрыторыі помніка ў перыяд бронзавага веку ўказваюць тры фрагменты керамікі тшцінецкага культурнага кола (адзін з іх арнаментаваны: мал. 6, *9*). Эпохай жалезнага веку датуюцца два фрагменты сценак. Актыўнае выкарыстанне даследаванай тэрыторыі працягвалася і ў перыяд Сярэднявечча і Новага часу, пра што сведчыць знаходка на помніку 151 абломку кругавога посуду.

Помнік уяўляецца перспектыўным для далейшых даследаванняў.




*Мал. 6.* Мікалаеўшчына VIII. Крамянёвыя вырабы і кераміка: *1* – нуклеус; *2* – фрагмент шліфаванай сякеры; *3–5* – кераміка нёманскай культуры; *6* – кераміка с прыкметамі культуры шарападобных амфар; *7, 8* – кераміка кола культуры шнуравой керамікі; *9* – кераміка тшцінецкай культуры.
Малюнак А. У. Вайтовіч

*Fig. 6.* Mikalajeŭščyna VIII. Flint artefacts and pottery: *1* – core; *2* – fragment of a ground axe; *3–5* – pottery of the Neman Culture; *6* – pottery with features of the Globular Amphora Culture; *7, 8* – pottery of the Corded Ware Culture range; *9* – pottery of the Trzciniec Culture.
Drawing by A. U. Vaitovich

## Заключэнне

Падчас разведак 2012–2014 гг. аўтарамі былі абследаваны 13 помнікаў археалогіі, тры з якіх выяўлены ўпершыню. Вынікам праведзенай працы стала ўпарадкаванне нумарацыі археалагічных помнікаў, лакалізаваных у ваколіцах вёсак Акінчыцы і Новы Свержань. Знаходкі, сабраныя ў ходзе паверхневых збораў і шурфовак, далі падставы для ўдакладнення адноснага датавання шэрагу стаянак. Прадстаўнічыя археалагічныя калекцыі, атрыманыя на паселішчах Акінчыцы III і Мікалаеўшчына VIII, дазволілі дапоўніць наяўныя ўяўленні аб асаблівасцях культурных працэсаў у рэгіёне ў першабытную эпоху. Новыя матэрыялы сведчаць пра непарыўнае і інтэнсіўнае асваенне даліны Нёмана ў ваколіцах Стоўбцаў на працягу ўсяго дагістарычнага перыяду, пачынаючы ад фінальнага палеаліту да бронзавага і жалезнага вякоў уключна.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Obuchowski W.* Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki zelaza z terenow Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie. Warszawa : Państwowe Muz. Archeologiczne, 2003.
2. *Чарняўскі М. М.* Неаліт Беларускага Панямоння. Мінск : Навука і тэхніка, 1979.
3. *Лакіза В. Л.* Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння. Мінск : Беларус. навука, 2008.
4. *Ашэйчык В. У., Зуева А. У.* Археалагічныя даследаванні ў ваколіцах вёскі Дразды Стаўбцоўскага раёна ў 2012 годзе // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2014. Вып. 25 : Вынікі даследавання першабытных і сярэдневяковых старажытнасцей Беларусі ў 2011–2012 гадах. С. 274–280.
5. *Ашэйчык В. У., Зуева А. У., Чарняўскі М. М.* Новыя матэрыялы каменнага веку з вярхоўяў Нёмана // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2014. Вып. 25 : Вынікі даследавання першабытных і сярэдневяковых старажытнасцей Беларусі ў 2011–2012 гадах. С. 172–178.
6. *Зуева А. У., Ашэйчык В. У.* Папярэднія вынікі раскопак паселішча Дразды-12 у 2013 годзе // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2015. Вып. 26 : Вынікі даследаванняў першабытных і сярэдневяковых помнікаў на тэрыторыі Беларусі (да 120-годдзя з дня нараджэння А. М. Ляўданскага). С. 300–305.
7. *Вайтовіч А. У., Ашэйчык В. У.* Новае пахаванне кола культуры шнуравой керамікі на Верхнім Панямонні // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2016. Вып. 27 : Вынікі даследаванняў першабытных і сярэдневяковых старажытнасцей Беларусі ў 2013–2014 гадах. С. 197–205.
8. *Asheichyk V., Vaitovich A.* A Late Neolithic Burial from the Drazdy 12 Site in the Upper Neman Region (Western Belarus) // Lietuvos Archeologija. 2016. Vol. 42. P. 105–125.
9. *Чарняўскі М. М.* Даследаванні ў 2008 г. на Панямонні і Падзвінні // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2011. Вып. 20 : Археалагічныя даследаванні на Беларусі ў 2008 г. С. 283–286.
10. *Чарняўскі М. М.* Археалагічныя помнікі Стаўбцоўскага раёна // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Стаўбцоўскага раёна / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2004. С. 38–43.
11. *Чарняўскі М. М.* Даследаванні на Панямонні і Падзвінні ў 2011 г. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Мінск, 2013. Вып. 24 : Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю. А. Заяца). С. 319–322.
12. *Шаблюк В. У.* Новы Свержань. Паселішча // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Мінск, 1987. Кн. 2. С. 241.

## References

1. Obuchowski W. Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki zelaza z terenow Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie. Warszawa : Państwowe Muz. Archeologiczne, 2003 (in Pol.).
2. Charniauski M. M. Nealit Belaruskaga Panyamonnya [The Neolithic of Belarusian Neman region]. Minsk : Navuka i tjehnika, 1979 (in Belarus.).
3. Lakiza V. L. Starazhytnasci poznjaga nealitu i rannjaga peryjadu bronzavaga veku Belaruskaga Panjamonnja [Antiquities of Late Neolithic and Early Bronze Age of Belarusian Neman River basin]. Minsk : Belarus. navuka, 2008 (in Belarus.).
4. Asheichyk V. U., Zuyeva A. U. [Archaeological investigations near Drazdy village in Staubcy District in 2012]. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials on the Archaeology of Belarus]. Minsk, 2014. Vol. 25 : [Results of the investigations of pre-historic and medieval antiquities of Belarus in 2011–2012]. P. 274–280 (in Belarus.).
5. Asheichyk V. U., Zuyeva A. U., Charniauski M. M. [New Materials of the Stone Age from the Basin of Upper Nioman]. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials on the Archaeology of Belarus]. Minsk, 2014. Vol. 25 : [Results of the investigations of pre-historic and medieval antiquities of Belarus in 2011–2012]. P. 172–178 (in Belarus.).
6. Zuyeva A. U., Asheichyk V. U. [Preliminary results of 2013 excavations at Drazdy-12 settlement]. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials on the Archaeology of Belarus]. Minsk, 2015. Vol. 26 : [The results of investigations of the prehistoric and medieval archaeological sites on the territory of Belarus (to the 120th anniversary of the birth of A. M. Liaudanski)]. P. 300–305 (in Belarus.).
7. Vaitovich A. U., Asheichyk V. U. [New Burial of the Corded Ware Culture Circle from the Upper Neman Basin]. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials on the Archaeology of Belarus]. Minsk, 2016. Vol. 27 : [Results of investigations of the Pre-historic and Medieval antiquities of Belarus in 2013–2014]. P. 197–205 (in Belarus.).
8. Asheichyk V., Vaitovich A. A Late Neolithic Burial from the Drazdy 12 Site in the Upper Neman Region (Western Belarus). *Lietuvos Archeologija*. 2016. Vol. 42. P. 105–125.
9. Charniauski M. M. [Investigations in the Neman and Dvina Rivers Regions in 2008]. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials on the Archaeology of Belarus]. Minsk, 2011. Vol. 20 : [Archaeological researches on the territory of Belarus in 2008]. P. 283–286 (in Belarus.).
10. Charniauski M. M. [Archaeological sites of Stoŭbcy District]. In: *Pamjac'. Gistoryka-dakumental'naja hronika Stawbcowskaga rajona* [Remembrance. Historical and documentary chronicle of Stoŭbcy District]. Minsk, 2004. P. 38–43 (in Belarus.).
11. Charniauski M. M. [Investigations in the Neman and Dvina Rivers Regions in 2011]. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi* [Materials on the Archaeology of Belarus]. Minsk, 2013. Vol. 24 : [The investigations of medieval antiquities of Central Belarus (in remembrance of Y. A. Zayatc)]. P. 319–322 (in Belarus.).
12. Shablyuk V. U. [Novy Svieržań. The Settlement]. In: *Zbor pomnikaw gistoryi i kul'tury Belarusi* [The collection of the monuments of history and culture of Belarus. Minsk Region]. Minsk, 1987. Vol. 2. P. 241 (in Belarus.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 17.01.2018.*
*Received by editorial board 17.01.2018.*